# Прамова Кісялёва

Беларускі дэлегат Кісялёў прысвяціў сваё выступленне пытанню аб грамадзянстве на тэрыторыях, якія пераходзяць ад Італіі да саюзных дзяржаў.

Дэлегацыя Злучаных Штатаў Амерыкі запатрабавала пашырыць на саюзныя дзяржавы той артыкул праекта мірнага дагавору з Італіяй, які прадугледжвае абавязак забяспечыць прадастаўленне на пераходзячыя тэрыторыі правоў чалавека і асноўных свабод, як гэта прадугледжана ў адносінах да былых варожых дзяржаў. Такім чынам, атрымліваецца, што дэлегацыя ЗША не робіць ніякай розніцы паміж былымі варожымі дзяржавамі і саюзнымі дзяржавамі, якія ўнеслі свой уклад у справу дасягнення перамогі над фашызмам. На думку беларускай дэлегацыі, такая пастаноўка пытання з'яўляецца несправядлівай, больш таго,— зневажальнай для ўсякай саюзнай дзяржавы, якой датычыць прапанова ЗША. Гэта — прамое парушэнне суверэнных правоў саюзных дзяржаў і ўмяшанне ў іх унутраныя справы, несумяшчальнае з статутам арганізацыі Аб'яднаных нацый.

Статут арганізацыі Аб'яднаных нацый асоба агаворвае, што гэтая арганізацыя не мае права ўмешвацца ва ўнутраныя справы якой-небудзь дзяржавы. У сваіх практычных дзеяннях дэлегацыя ЗША не прытрымліваецца гэтага прынцыпа, запісанага ў статуце. Яна становіцца на меркаванняў і доваду, якія гавораць аб памылковасці прынятага камісіяй параграфа 4 артыкула 13 праекта мірнага дагавору.

Беларуская дэлегацыя заклікае пленум канферэнцыі адхіліць прапанову дэлегацыі ЗША, змешчаную ў параграфе 4 артыкула 13 праекта мірнага дагавору з Італіяй.

Беларуская дэлегацыя звяртае таксама ўвагу пленума канферэнцыі на пытанне аб грамадзянстве на Свабоднай Тэрыторыі Трыест. Камісія прыняла большасцю галасоў прапанову дэлегацыі ЗША, якая прадугледжвае, што ў гэтым пытанні Свабодная Тэрыторыя Трыест не павінна разглядацца, як пераходзячая тэрыторыя. Адначасова камісія прыняла прапанову дэлегацыі Францыі, якая ўказвае, што неабходнай умовай для набыцця карэннага грамадзянства Свабоднай Тэрыторыі з'яўляецца пражыванне на гэтай тэрыторыі на 10 чэрвеня 1940 года.

Беларуская дэлегацыя выказалася за прапанову, унесеную савецкай дэлегацыяй, у якой гаворыцца: «Грамадзянства Свабоднай Тэрыторыі Трыест прадастаўляецца былым італьянскім грамадзянам, якія жылі на 10 чэрвеня 1940 года і працягваюць жыць на гэтай тэрыторыі да дня ўступлення ў моц мірнага дагавору з Італіяй. Аднак правам на набыццё трыесцінскага грамадзянства не карыстаюцца актыўныя дзеячы фашысцкага рэжыма ў

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы